СУСТРЭЧЫ




# «ВЫХАД У СВЕТ» КРАЯЗНАЎЧЫ

**ЛІДА. 16 мая ў бібліятэцы № 4 горада Ліды (Гродзенская вобласць) адбылося чарговае пасяджэнне літаратурнай гасцінай «Выхад у свет» (год стварэння 2019-ы). У доўгатэрміновым грамадска-літаратурным праекце лідскіх паэтаў Руслана і Святланы Піваваравых прыняў удзел госць з абласнога цэнтра, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, публіцыст, краязнавец Аляксандр Сявенка.**

**Для даведкі.** Тры гады таму запрашэнне да супрацоўніцтва з праектам «Выхад у свет» атрымаў калектыў Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі (старшыня заслужаны дзеяч культуры Беларусі, паэтэса, празаік, перакладчык Людміла Антонаўна Кебіч). У рамках праекта сваю творчасць паспелі прадэманстраваць нямала літаратараў з абласнога цэнтра. Прычым спярша гэта былі пачаткоўцы, невядомыя аўтары, таленавітая моладзь. Пачынаючы з восені 2024 года (з уступленнем у шэрагі СПБ аднаго з арганізатараў гасцінай Руслана Півавара), перад лідскімі калегамі і аматарамі чытання выступаюць выключна члены Саюза пісьменнікаў Беларусі. Гродзенскім куратарам (рэзідэнтам) літаратурнай гасцінай у Лідзе з'яўляецца член СПБ, паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык.

Дзмітрый Мікалаевіч прадставіў госця лідскім калегам. На майскую сустрэчу па традыцыі прыйшлі прадстаўнікі Лідскага раённага літаратурнага аб'яднання «Суквецце» (кіраўнік паэт Уладзімір Глінін) і члены акрэдытаванай у Лідзе Міжнароднай літаратурнай суполкі «Чертог поэта» (кіраўнік член Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэт Руслан Піварараў). Аляксандр Сявенка праявіў сябе цікавым расказчыкам. Гродзенскі творца прапанаваў аўдыторыі некалькі вельмі займальных гісторый з уласнага вопыту даследчыка мінулага, прадэманстраваў некалькі экспанатаў з сваёй унікальнай калекцыі (а Аляксандр Віктаравіч у Гродне вядомы яшчэ і як калекцыянер), зрабіў прэзентацыю сваіх шматлікіх публікацый і нават прадэкламаваў вершы ўласнага сачынення. Аляксандр Віктаравіч Сявенка – асоба вельмі глыбокая і змястоўная. Гэты чалавек у пэўны час здолеў атрымаць тры вышэйшыя адукацыі па розных спецыяльнасцях плюс скончыць аспірантуру. Лічыць сябе рэгіянальным аўтарам, яго нарысы і артыкулы з зайздроснай рэгулярнасцю выходзяць выключна ў перыёдыцы Прынёманскага краю – часопісах «Гродно» і «Твой город Гродно», газетах «Вечерний Гродно», «Гродзенская праўда», «Перспектива», «Гродзенскі ўніверсітэт». Таксама матэрыялы гродзенскага пісьменніка-гісторыка, ваеннага журналіста, спецыяльнага карэспандэнта інфармацыйнага агенства «Ваяр» можна сустрэць на старонках газет «Армия», «Звязда», «Белорусская военная газета. Во славу Родины», «Народная газета», «СБ. Беларусь сегодня», «Літаратура і мастацтва».




Амаль 30 гадоў прысвяціў службе ва Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь. У 2006-2010 гадах працаваў на пасадзе намесніка дэкана на адным з факультэтаў ГрДУ імя Янкі Купалы. З'яўляецца аўтарам дзясяткаў навуковых публікацый, прысвечаных гісторыі роднага краю і роднага горада Гродна. У 2012 годзе Аляксандр Віктаравіч апублікаваў навукова-папулярнае выданне «70 лет на страже Отечества: история и боевой путь 28-й общевойсковой Краснознаменной армии» (у суаўтарстве). У 2017-м годзе – навукова-папулярную манаграфію «Наследники славных традиций. К 75-летию 28-й общевойсковой Краснознаменной армии». У 2024 годзе пабачыла свет кніга А. В. Сявенкі «80 мирных лет» (у суаўтарстве з Сяргеем Занеўскім). Акрамя літаратурнай творчасці, літаратар займаецца актыўнай грамадскай дзейнасцю. Ён старшыня камісіі па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў пры Гродзенскім абласным савеце ветэранаў, член камісіі па называнні вуліц абласнога цэнтра пры Гродзенскім гарвыканкаме. Фактычна ў



госці да лідчан прыехаў чалавек, якога можна назваць жывой энцыклапедыяй. І ў гэтым не будзе ніякага перабольшання. Аб’ём кампетэнцый пісьменніка-навукоўца, яго кругагляд сапраўды ўнікальныя. У сваім выступленні Аляксандр Сявенка пагартаў старонкі гісторыі Лідчыны і біяграфій некаторых лідчан. Закранулі тэму калекцыянавання. Выступленне госця выклікала цікавасць, што пацвердзілі шматлікія пытанні аўдыторыі.









Падчас майскай сустрэчы ў літаратурнай гасцінай «Выхад у свет» яе ўдзельнікі шмат увагі надалі тэме Вялікай Айчыннай вайны і Вялікай Перамогі. Дзмітрый Радзівончык зрабіў прэзентацыю кнігі члена СПБ, краязнаўцы, публіцыста Галіны Антонавай (Смаргонь) «Вайна ў асобах. Непрыдуманыя гісторыі герояў», а таксама свайго літаратурна-крытычнага артыкула пра гэтае выданне.

У другой палове мерапрыемства выступілі лідскія творцы, пераважна паэты: Руслан Півавараў (вядучы, член СПБ), Вольга Верасняк, Ала Юшко, Ігар Вербавік, Ганна Рэлікоўская, Уладзімір Глінін і іншыя. Паэт Валерый Мацулевіч прадэкламаваў верш свайго брата Аляксандра «Курган бессмертия». Кароткі агляд сваёй дзейнасці прапанавала лідская краязнаўца, пісьменніца-педагог Наталля Анашкевіч. Ад чытацкай супольнасці Лідчыны са шчырай прамовай да гасцей звярнулася педагог-філолаг Вольга Высоцкая. Развітваючыся, людзі выказвалі ўдзячнасць за цікавы і карысны эпізод літаратурнага жыцця, які ў чарговы раз прыняў другі па велічыні горад нашага Прынёманскага краю. Скончылася майская літаратурная сустрэча сумесным фатаграфаваннем і прагулкай па Лідзе.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** пасяджэнне літаратурнай гасцінай «Выхад у свет» з удзелам члена Саюза пісьменнікаў Беларусі, гродзенскага краязнаўца, публіцыста-гісторыка Аляксандра Сявенкі. Ліда, гарадская бібліятэка № 4. 16 мая 2026 года.



**Госці з Гродна, члены СПБ Дзмітрый Радзівончык і Аляксандр Сявенка**




**Гасцей прадстаўляе вядучы, адзін з ініцыятараў літаратурнай гасцінай «Выхад у свет», паэт Руслан Півавараў**




**Калегу па пісьменніцкай арганізацыі прадстаўляе Дзмітрый Радзівончык (Гродна)**




Аляксандр Сявенка, журналіст, пісьменнік, афіцэр, калекцыянер і проста вельмі цікавы чалавек





**Гучаць пытанні аўдыторыі**




**Дзмітрый Радзівончык**



**Наталля Анашкевіч**



**Ганна Рэлікоўская. Памяці маці**





**Калегі-краязнаўцы Аляксандр Сявенка (Гродна) і Наталля Анашкевіч (Ліда)**



**Выступае Вольга Высоцкая**



**Ігар Вербавік**




**Кіраўнік Лідскага раённага літаб’яднання «Суквецце», паэт Уладзімір Глінін**




**Валерый Мацулевіч**




**Людміла Дарафейчык**






**Руслан Півавараў (СПБ-Ліда)**

**Вольга Верасняк**




**Малады чалавек прадставіўся Сяргеем**




Ала Юшко




Стиль жизни


Стиль жизни - здоровье
КУРСК 1943



Выход в свет



**Усе разам**






**Вулічная мінібліятэка**






Ковярня







**Аляксандр Сявенка ў Лідзе. Май 2026 года** *Фота Святланы і Руслана Піваваравых*

